


*Пераможца Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Ліцера»*

MCMXL

**ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»**

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1986 года

Выходзіць адзін раз на месяц | № 8 (486) 3 верасня 2019 года | Распаўсюджваецца бясплатна




***Дарагія Купалаўцы!***
***Паважаныя студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі!***
***Сардэчна віншую Вас з Днём ведаў!***

*Дзень ведаў – свята дзіўных адкрыццяў, мудрасці, працавітасці і надзей. Гэты дзень аб'ядноўвае ўсіх, хто імкнецца спасцігнуць свет і раскрыць у ім самога сябе, хто разумее і адчувае сілу ведаў, іх неабходнасць і значнасць. Менавіта з першага вераснёўскага дня пачынаецца адказны і разам з тым захапляльны перыяд – новы навучальны год. Ён стане асаблівым для ўсёй Купалаўскай сям'і – мы стаім на парозе 80-годдзя нашай Alma Mater!*

*Асаблівы ён і для нашых першакурснікаў. З натхненнем і хваляваннем Вы пачынаеце новую старонку свайго жыцця, якое, упэўнена, будзе напоўнена цікавымі сустрэчамі, незабыўнымі ўражаннямі і бязмежнымі магчымасцямі. Толькі ад Вас залежыць Ваш поспех, ад жадання вучыцца і развівацца, умення ставіць мэты і дасягаць іх. Жадаю Вам насычаных карысным вопытам, сяброўствам і каханнем студэнцкіх гадоў. Будзьце адкрытымі да інавацый, прапаноўвайце новыя ідэі, раскрывайце свае таленты! Знайдзіце сябе з намі!*

*Звяртаючыся да студэнтаў старэйшых курсаў, магістрантаў, аспірантаў, якія з гонарам нясуць імя "Купалавец", хачу пажадаць далейшых дасягненняў у вучобе, навуцы, спорце і грамадскім жыцці. Заўсёды памятайце, што ГрДУ імя Янкі Купалы ганарыцца Вамі і Вашымі поспехамі!*

*Шаноўныя калегі! Я шчыра жадаю, каб новы навучальны год стаў для Вас эфектыўным і плённым, годам новых дасягненняў. Няхай Вашыя пачынанні заўсёды суправаджаюць творчае натхненне і стваральная ініцыятыва, а Вашыя энергія і вопыт будуць асновай паспяховага выканання намечаных планаў! Няхай захапляльная праца і сапраўднае імкненне да новага стануць нашымі спадарожнікамі ў няспынным развіцці Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы! Са святам!*

***З вялікай павагай,***
***Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы***
***Ірына Кітурка***

# АДУКАЦЫЯ - НАЙЛЕПШАЕ БАГАЦЦЕ

**Свята ведаў прайшло ў Купалаўскім універсітэце** /Стар. 2/

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ


**АСОБА**

**Эканоміка, з якой па дарозе: траекторыя жыцця Марыны Карпіцкай**

Юбілейны дзень нараджэння адзначыла дэкан факультэта эканомікі і кіравання ГрДУ імя Янкі Купалы Марына Карпіцкая.

Стар. 6

**ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ-2019**

**Папаўненне ў Купалаўскай сям'і**

Вынікі прыёмнай кампаніі-2019 і святочнае прысвячэнне ў першакурснікі.

Стар. 3

**INTERBУЗ**

**Эканоміка, экалогія, філалогія: лета з карысцю ў ГрДУ імя Янкі Купалы**

Чым прываблiваюць Летнія школы Купалаўскага ўніверсітэта замежных гасцей.

Стар. 4-5




**УЧЁНАЯ СТУПЕНЬ КАНДИДАТА ЭКОНОМИЧЕСКИХ НАУК**

присуждена **Светлане Ивановне Протасене**, старшему преподавателю кафедры экономики и управления на предприятии

**УЧЁНАЯ СТЕПЕНЬ ДОКТОРА БИОЛОГИЧЕСКИХ НАУК**

присуждена **Олегу Викторовичу Созинову**, заведующему кафедрой ботаники

АФІЦЫЙНА

# АДУКАЦЫЯ - НАЙЛЕПШАЕ БАГАЦЦЕ

Святочнае мерапрыемства да Дню ведаў і пачатку навучальнага года 2 верасня аб'яднала Купалаўцаў у самым "сэрцы" ўніверсітэта – на Плошчы ўніверсітэцкага сцяга.

Павіншаваць са святам і пажадаць поспехаў у новым навучальным годзе сабраліся рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы, выпускніца ГрДУ імя Янкі Купалы Лілія Кір'як, прарэктары, дэканы факультэтаў, прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу, а таксама студэнты, магістранты і аспіранты.



Па традыцыі пачатак новага навучальнага года сімвалічна суправаджаецца падняццем сцягу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Права вынесці сцяг універсітэта даручана лепшым студэнтам, магістрантам і аспірантам, якія сваімі высокімі дасягненнямі ў сферы навукі, адукацыі, культуры і спорту праславілі ГрДУ імя Янкі Купалы па ўсёй Беларусі і за яе межамі, а таксама лідарам студэнцкага самакіравання.

Прывітала і павіншавала студэнтаў, выкладчыкаў і выпускнікоў рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка:

– *Дарагія студэнты! Універсітэт вельмі сумаваў без вас летам, але мы з задавальненнем назіралі за вашымі поспехамі ў будаўнічых атрадах, творчых мерапрыемствах, спартыўных спаборніцтвах – мы былі ўсе разам, таму што разам робім адну справу, якая дае нам ганаровае права называцца слаўным словам "Купалаўцы". Сёння мы сабраліся ў самым "сэрцы" ўніверсітэта для таго, каб павіншаваць адзін аднаго з новым навучальным годам і пажадаць новых поспехаў, планаў і іх ажыццяўлення.*

Ірына Фёдараўна адзначыла, што сёння на Плошчы ўніверсітэцкага сцяга не выпадкова прысутнічае 891 студэнт, таму што менавіта столькі гадоў гораду Гродна – аднаму з самых старэйшых і прыгожых гарадоў Беларусі.

– *Вашы бацькі зрабілі вам самы дарагі падарунак – яны далі вам жыццё. І сёння ў сценах нашага ўніверсітэта вы закладваеце падмурак для сваёй будучыні,* – дадала Ірына Кітурка. – *Вучыцеся, тварыце, любіце, кахайце, рабіцё ўсё на карысць сабе, сваёй сям'і, нашай краіны, каб вашы бацькі ганарыліся вамі. Калегам хачу пажадаць плённай працы, новых планаў і праектаў. Са святам вас, дарагія Купалаўцы. З новым навучальным годам!*

Са словамі віншаванняў да калектыву Купалаўскага ўніверсітэта звярнулася ганаровы госць мерапрыемства, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы, выпускніца ГрДУ імя Янкі Купалы Лілія Кір'як.

Ад імя дэканаў факультэтаў са словамі віншавання звярнуўся дэкан факультэта біялогіі і экалогіі Аляксандр Карэўскі, а ад імя ўсіх студэнтаў павіншавала калектыў універсітэта першакурсніца філалагічнага факультэта Ганна Шчэрбачэня.

Падчас мерапраемства рэктар Ірына Кітурка і Лілія Кір'як уручылі пасведчанні аб занясенні на Дошку гонару "Імі ганарыцца ўніверсітэт" лепшым студэнтам, магістрантам і аспірантам ГрДУ імя Янкі Купалы, якія дасягнулі поспехаў у адукацыі, навуцы, творчасці і спорце.

**Марыя ПАНІЧАВА**

# СВЯТА РОДНАГА СЛОВА

Купалаўцы на чале з рэктарам ГрДУ імя Янкі Купалы Ірынай Кітурка прынялі актыўны ўдзел у святкаванні Дня беларускай пісьменнасці ў Слоніме. Канцэртная праграма, графічная майстэрня і літаратурна-гістарычнае падарожжа сталі своеасаблівым падарункам гасцям свята.



Дзень беларускай пісьменнасці праводзіцца штогод у першую нядзелю верасня. Канцэпцыя свята прадугледжвае паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменнасці і друку ў Беларусі.

Традыцыйна свята праходзіць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадруку. Сталіцамі свята станавіліся Тураў, Навагрудак, Пінск, Мір, Заслаўль, Шклоў, Быхаў і іншыя. Сёлета быў абраны старажытны горад Слонім. У межах свята прайшла цырымонія адкрыцця помніка Льву Сапегу. Адной з галоўных падзей свята стала ўзнагароджванне пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміяй, акрамя таго прайшлі цікавыя мерапрыемствы і сустрэчы, фестывалі кнігі і прэсы; выніковы этап рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў "Жывая класіка".

1 верасня ў межах свята працавалі некалькі тэматычных пляцовак, у арганізацыі адной з іх – моладзевай – прынялі ўдзел студэнты-купалаўцы. Творчы калектыў ГрДУ імя Янкі Купалы падарыў гасцям свята канцэртную праграму "Ты пяшчотная і магутная… сінявокая Беларусь", студэнты факультэта мастацтваў і дызайна – графічную майстэрню, а ўдзельнікі праекта "Жывая гісторыя" западрасілі ў літаратурна-гістарычнае падарожжа са знакамітымі постацямі беларускай зямлі – Цёткай, Зоськай Верас, Канстанцыяй Буйло, Элізай Ажэшка, Антоніем Тызенгаўзам і Ефрасіняй Полацкай. Тэатральны калектыў універсітэта паказаў пастаноўку па адным з твораў Уладзіміра Караткевіча. Акрамя таго купалаўцы ў якасці валанцёраў зладзілі дзіцячую пляцоўку.

Забаўляльныя праграмы прайшлі на ўсіх пляцоўках горада. Завяршыўся Дзень беларускага пісьменства-2019 перадачай эстафеты правядзення свята гораду Бялынічам, а таксама гала-канцэртам "Льецца песня па-над Шчарай" і феерверкам.

**Таццяна СУШКО**

**Студенты ГрГУ имени Янки Купалы в числе призеров Кубка мира по борьбе на поясах**

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ-2019

# ПАСТУПІЛІ ПРАВІЛЬНА!

Сёлета дружная Купалаўская сям'я гасцінна прыняла 2 352 першакурснікі дзённай, завочнай, вячэрняй форм навучання за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове. Нерадзе іх чакае нялёгкае, але цікавае і насычанае студэнцкае жыццё. Разам са сваімі выкладчыкамі яны будуць ісці наперад, спасцігаць новыя веды, імкнуцца да таго, каб наша краіна квітнела і развівалася.

Думкі, перажыванні, хваляванні і чаканні: некаторыя з тых, хто толькі пераступіў парог універсітэта, падзяліліся сваімі першымі ўражаннямі.

**2352** ПЕРШАКУРСНІКІ

**1048** БЮДЖЭТНАЯ ФОРМА
**2,43** СЯРЭДНІ КОНКУРС

**1304** ПЛАТНАЯ ФОРМА
**1,23** СЯРЭДНІ КОНКУРС

44% / 56%

**10,5** НАЙВЫШЭЙШЫ КОНКУРС НА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ «ДЫЗАЙН (ПА НАКІРУНКАХ)»

**381** НАЙБОЛЬШАЯ КОЛЬКАСЦЬ БАЛАЎ У ДЗВЮХ ПЕРШАКУРСНІЦ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

**478** МАЮЦЬ СУМУ БАЛАЎ 300 І ВЫШЭЙ

**209** СКОНЧЫЛІ ШКОЛУ З МЕДАЛЁМ ЦІ ДЫПЛОМАМ З АДЗНАКАЙ

**17** ПЕРАМОЖЦАЎ ЧЭМПІЯНАТАЎ РБ ПА АЛІМПІЙСКІХ ВІДАХ СПОРТУ

**4** МАЙСТРЫ СПОРТУ МІЖНАРОДНАГА КЛАСА

**17** МАЙСТРАЎ СПОРТУ

**25** КАНДЫДАТАЎ У МАЙСТРЫ СПОРТУ

**САМЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:**
«МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА»
«ЛІНГВІСТЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МІЖКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ (ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ)»
«ІНФАРМАЦЫЯ І КАМУНІКАЦЫЯ»
«ЭКАНАМІЧНАЕ ПРАВА»
«ПРАВАЗНАЎСТВА»

NEW!
**НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:**
«КАМЕРЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ» (з. скар.)
«КАМП'ЮТАРНАЯ ФІЗІКА» (дзённ.)
«ТРАНСПАРТНАЯ ЛАГІСТЫКА (АЎТАМАБІЛЬНЫ ТРАНСПАРТ)» (дзённ./з. скар.)
«ГІСТОРЫЯ (АРХЕАЛОГІЯ)» (дзённ.)

*"Я паступіў на спецыяльнасць "Камп'ютарная фізіка". Лічу яе ўнікальнай, таму што акрамя праграмавання буду вывучаць электронна-вылічальную тэхніку і фізіку".*

**Уладзіслаў Скрундзь, фізіка-тэхнічны факультэт**

*"У ГрДУ імя Янкі Купалы, куды мне параілі пайсці вучыцца калегі, хачу павысіць сваё прафесійнае майстэрства. У будучыні планую стаць выкладчыкам".*

**Злата Шпак, факультэт біялогіі і экалогіі**

*"Выбраў факультэт фізічнай культуры, бо актыўна займаюся спортам і мару стаць трэнерам".*

**Марк Шока, факультэт фізічнай культуры**

*"Вельмі люблю прыроду і хачу стаць прафесійным эколагам, каб захаваць яе для наступных пакаленняў. Ва ўсякім разе, накірую ўсе свае намаганні на тое".*

**Фёдар Марсаў, факультэт біялогіі і экалогіі**

ТРАДИЦИИ

# VIVAT, ПЕРВОКУРСНИК!

Накануне нового учебного года 30 и 31 августа первокурсники собрались в стенах Гродненского государственного университета имени Янки Купалы.

Участниками торжественных мероприятий стали ректор Ирина Китурко, проректоры и деканы университета, руководители первичных и общественных организаций, первокурсники 14 факультетов ГрГУ имени Янки Купалы и колледжей, входящих в структуру высшего учебного заведения. Поддержать ребят в эти волнительные дни пришли их родители и друзья.

Поприветствовала участников мероприятия ректор Гродненского государственного университета имени Янки Купалы Ирина Китурко:

*– Сегодня очень торжественный и важный день в жизни университета: мы стали богаче почти на две с половиной тысячи новых студентов, которые с гордостью будут нести имя «Купаловец». С хорошим настроением и эмоциями мы вступаем в новый учебный год.*

Ирина Фёдоровна рассказала первокурсникам и их родителям об истории Купаловского университета, достижениях студентов и выпускников, а также о возможностях, которые созданы в ГрГУ имени Янки Купалы для самореализации в науке, образовании, творчестве и спорте. Ребята узнали о том, какие позиции занимает университет в международном пространстве, познакомились с традициями корпоративной культуры и возможностями для реализации своих будущих инновационных проектов.




В этот день лучшим первокурсникам, которые по итогам централизованного тестирования и вступительных испытаний показали высокие результаты, ректор Ирина Китурко в торжественной обстановке вручила студенческие билеты.

По сложившейся в университете традиции Купаловцы старших курсов передали первокурсникам символический студенческий билет и ключ знаний. Поздравили ребят с поступлением в ГрГУ имени Янки Купалы студент 3 курса инженерно-строительного факультета, активист, участник строительного отряда третьего трудового семестра Артем Болтуть и студентка 2 курса педагогического факультета, победительница республиканского конкурса грации и артистического мастерства «Королева весна Республики Беларусь», призер международного конкурса «Королева студенчества» Татьяна Щербач.

Еще одна традиция торжественного мероприятия – церемония клятвы первокурсников. Ребята пообещали с достоинством нести звание студента ГрГУ имени Янки Купалы, не жалеть сил и времени на постижение всех наук, быть достойными преемниками традиций белорусского студенчества, полученные знания направлять на укрепление могущества и процветания Республики Беларусь и быть достойными гражданами нашей страны.

**Мария ПАНИЧЕВА**




**ГрГУ имени Янки Купалы подписал договор о сотрудничестве с Мальтепским университетом (Турция)**

# ЭКОНОМИКА, ЭКОЛОГИЯ, ФИЛ

## ЛЕТО

Лето - время отдыха и развлечений, новых впечатлений и позитивных эмоций. Как его провести тем, кто постоянно жаждет знаний? Этим летом желающие поучиться смогли провести свой отдых с пользой, приняв участие в Летних школах Гродненского государственного университета имени Янки Купалы. Иностранных гостей традиционно ждали активные занятия, полезный практический опыт, новые знания, интересные знакомства и широкие возможности.

**Что?** Летняя школа беларускай мовы і культуры
**Где?** Навуковая бібліятэка ГрДУ імя Янкі Купалы
**Когда?** З 5 па 15 жніўня

У гэтым годзе школа беларускай мовы і культуры прайшла ў ГрДУ імя Янкі Купалы ўпершыню. Яна раскрыла свае дзверы для слухачоў з Расіі – тых, хто марыць авалодаць мовай, каб можна было свабодна размаўляць па-беларуску.

Напрыклад, Марыя Ламм з Інстытута славяназнаўства РАН, якая на радзіме займаецца падрыхтоўкай кандыдацкай дысертацыі на тэму сучаснай гродзенскай літаратуры, прыехала на Летнюю школу з мэтай загаварыць па-беларуску, набыць веды для напісання навуковых артыкулаў, а таксама атрымаць асалоду ад чытання кніг па-беларуску. Яе любімае беларускае слова "сябрына".

У захапленні ад Беларусі, Гродна і выкладчыкаў Летняй школы Марыя Дораш, студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В.Ламаносава, якая прыехала ў Беларусь упершыню. Знаёмства з беларускай мовай у дзяўчыны адбылося падчас наведвання факультатыўных заняткаў па беларускай мове, арганізаваных Цэнтрам беларускай мовы, літаратуры і культуры пры МДУ імя М.В. Ламаносава.

Аляксандра Шыракава, магістрантка МДУ імя М.В.Ламаносава спецыяльнасці "Паланістыка", акрамя польскай мовы вывучае харвацкую і ўкраінскую, а калі пачула пра набор на факультатыўныя заняткі па беларускай мове, неадкладна вырашыла ўключыць у спіс вывучаемых славянскіх моў і беларускую.

Удзельнікаў чакалі разнастайныя заняткі і майстар-класы па беларускім вымаўленні, правапісе, граматыцы, культуры маўлення, фразеалогіі беларускай мовы. Акрамя таго, адбыліся экскурсіі па Гродна, вандроўкі па гістарычных мясцінах Беларусі, сустрэчы з гродзенскімі пісьменнікамі, прагляд фільма беларускага кінематографа, знаёмства з духоўнай народнай скарбонкай – гульнямі, традыцыямі і святамі беларусаў.

Напрыканцы навучання слухачы напісалі выніковы тэст і атрымалі сертыфікаты.

**Что?** Диалог между ЕС и ЕАЭС
**Где?** Факультет экономики и управления
**Когда?** С 8 по 18 июля

В этом году международная Летняя школа была посвящена маркетинговым исследованиям туристической зоны г. Гродно – гостиничного сервиса, ресторанного бизнеса. Конечная цель – привлечение большего количества туристов, иностранных гостей в Гродненский регион. Участниками мероприятия стали 11 студентов, магистрантов и докторантов из Литвы, Польши и Ирака, а также 6 белорусских студентов. Обучение проводилось на английском и польском языках.

Интерес к Летней школе проявляют представители не только постсоветского пространства, но и стран Европейского союза. Приятной неожиданностью и подтверждением высокого качества Летней школы стало постоянное участие магистрантов из Университета в Белостоке.

Так, Марта Максимчук приезжает в Летнюю школу в Гродно уже не первый раз. На вопрос, чем привлекает ее данный проект, она ответила, что в первую очередь, конечно, практикой:

*– Мы можем пойти, посмотреть, как это осуществляется на деле. Тем более, я занимаюсь развитием польско-белорусских торговых отношений. В прошлом году мы были на границе и на бирже, программа была очень разнообразная, в этом году не менее интересно.*

Все слушатели приняли участие в маркетинговом исследовании «Таинственный покупатель». Они посещали кофейни, бары, рестораны, предприятия фаст-фуда для того, чтобы оценить качество еды, напитков, сервиса и затем на основе исследования выполнить проектное задание и защитить его.

Для участников Летней школы были прочитаны лекции по инновационным методам менеджмента и маркетинга, состоялись мастер-классы под руководством университетских преподавателей и успешных бизнесменов: «Как осуществить продвижение HoReCa бизнес», «Информационые технологии в HoReCa», «Модели поведения клиентов HoReCa», «Бизнес-анализ в HoReCa». На мастер-классах участники Летней школы под руководством опытных шеф-поваров и барменов сами приготовили блюда белорусской кухни, пиццы и коктейли. На круглых столах «Менеджмент и маркетинг HoReCa», «Как создать HoReCa бизнес в Беларуси», «Какие необходимы компетенции менеджеру HoReCa», «Реклама в HoReCa» обсудили проблемы применения информационных технологий, кросс-культурного менеджмента, различные подходы к клиентам, бизнес-модели и новые форматы в HoReCa.

Обязательным элементом проекта стало проведение мастер-классов с участием бизнесменов, представителей гостиничного, ресторанного и туристического бизнеса, которые поделились с участниками Летней школы своими историями успеха и рассказали о проблемах, с которыми им приходится сталкиваться.



50 лет спустя: в ГрГУ имени Янки Купалы прошел Вечер встречи выпускников 1969 года

INTERВУЗ

# ОЛОГИЯ:
# С ПОЛЬЗОЙ В ГРГУ ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ



**Что?** Летняя школа русского языка
**Где?** Факультет довузовской подготовки
**Когда?** С 4 по 24 августа

Участниками Летней школы стали слушатели из Австрии, Германии, Канады, Китая, Польши, США, Чехии, Японии. Впервые посетили Купаловский университет граждане Венгрии, Индии и Швейцарии.

Среди участников Летней школы есть свободно владеющие русским языком и только начинающие изучать великий и могучий. Так, Паула Хофман из Германии приехала в Гродно с целью выучить русский язык, потому что в скором времени собирается переезжать в Россию на полгода в город Владивосток, откуда родом её парень. Любимое русское слово девушки – «любовь».

Хобби – изучение славянских языков – привело 52-летнего Германа Одой в ГрГУ имени Янки за усовершенствованием русского языка. Нацуми Сайто приехала из Японии. Увлечение русской историей, русской классической музыкой побудило девушку заняться изучением русского языка.

Проект настолько полюбился многим иностранным гостям, что они приезжают сюда уже не в первый раз. Например, участник из Германии Бернд Адам стал слушателем Летней школы в четвертый раз.

Ежедневно для слушателей были организованы занятия по деловому русскому, караоке по-русски и лингвострановедению с опытными преподавателями, а также культурные мероприятия: экскурсии в музеи, храмы, гродненские предприятия. Они прослушали лекции по истории и культуре Беларуси, познакомились с белорусским кинематографом, а также посетили мастер-классы по изготовлению белорусских сувениров и приготовлению блюд национальной кухни.

В завершение работы Летней школы каждый участник получил сертификат.

Организатором Летней школы русского языка выступила кафедра языковой подготовки белорусских и иностранных граждан факультета довузовской подготовки ГрГУ имени Янки Купалы.

**Что?** Сохранение водных ресурсов озера Белое и проблемы получения чистой питьевой воды
**Где?** Факультет биологии и экологии
**Когда?** С 8 по 14 июля

Международная Летняя школа «Сохранение водных ресурсов озера Белое и проблемы получения чистой питьевой воды» была впервые проведена на факультете биологии и экологии Гродненского государственного университета имени Янки Купалы и объединила участников из 5 стран: Польши, Туркменистана, Украины, России и Беларуси.

На протяжении недели студенты и магистранты осваивали экологические методики по мониторингу водных экосистем, участвовали в реализации научно-образовательного проекта на озере Белое, изучали проблемы получения чистой питьевой воды.

Ключевым событием Летней школы стало проведение исследовательских работ на пяти участках озера Белое. Ребята школы осуществили биологический мониторинг после запуска системы песконефтеотделителя сточных вод.

Вооруженные сачками, по пояс в воде и в резиновых костюмах, молодые люди отлавливали водных обитателей озера. Их видовую отнесенность сверяли по учебникам. Для каждого студента проект экологической направленности был интересен и полезен по-своему.

Так, Юлия Тамашова, студентка 3 курса факультета биологии и экологии ГрГУ имени Янки Купалы, рассказала:

*– Классно, что есть возможность работать летом, развиваться. Кроме того, исследование моллюсков напрямую связано с моей научной работой и способствует защите озера и в целом спасению природы.*

Аркадиуш Худик, студент Поморской академии в Слупске, Республика Польша:

*– Проводя эксперимент о состоянии озера, мы учимся. Интересно посмотреть биоразнообразие Беларуси в сравнении с Польшей. Да и вообще, каждому в мире полезно узнать о состоянии природы и экологии в разных странах.*

Ребята успели принять участие в мастер-классах по приготовлению летних напитков с продуктами пчеловодства на чистой питьевой воде на ООО «Мядовы шлях» в агрогородке Поречье Гродненского района, познакомились с историей пчеловодства в Беларуси, технологией приготовления мёда и мёдопродуктов и даже продегустировали сладкий продукт. А побывав на экскурсии в санатории «Поречье», познакомились с мероприятиями по водообеспечению санатория и агрогородка чистотой питьевой водой, включая этапы установки станции обезжелезивания воды.

В завершение работы Летней школы каждый участник получил сертификат.

**Татьяна СУШКО, Мария ПАНИЧЕВА, Ия ПОМАЗАНОВА**

**7 сентября состоится Воинская присяга курсантов первого курса военного факультета**

ПЕРСОНА

# ЭКОНОМИКА, С КОТОРОЙ ПО ПУТИ:
## ТРАЕКТОРИЯ ЖИЗНИ МАРИНЫ КАРПИЦКОЙ



В июле свой юбилейный день рождения отметила декан факультета экономики и управления ГрГУ имени Янки Купалы, доцент, кандидат экономических наук, удивительный и разносторонний человек, талантливый руководитель, председатель Первичной организации ГрГУ имени Янки Купалы ОО «Белорусский союз женщин», яркая и обаятельная женщина, заботливая мама и дочь – Марина Карпицкая. Юбилей заставляет каждого сделать остановку, подвести итоги и составить планы на будущее. Именно о них – профессиональных и личных – рассказала Марина Евгеньевна в интервью корреспонденту газеты «Гродзенскі ўніверсітэт».

### Вперёд, к цифровой экономике!

По словам Марины Карпицкой, как декан факультета экономики и управления она стремится к успешному развитию образовательного и научного потенциала факультета:

*– Сегодня «ставка» в обучении студентов делается на использование элементов цифровой экономики: внедряются технологии блокчейн, заданы рамочные условия для использования токенов, криптовалют. Поэтому наш выпускник не только обосновывает экономический эффект проекта и коммерциализирует результаты работы, но и владеет современными IT-технологиями. Мы ведём совместную работу с другими факультетами по изучению потребностей региона в специалистах и открытию специальностей, связанных с IT-подготовкой и цифровой экономикой.*

В последние годы, как отметила собеседница, традиционно востребованы специальности «Электронный маркетинг», «Информационные системы и технологии в (экономике)». Подготовка студентов всех экономических специальностей организована в условиях максимально приближенных к их будущей деятельности на предприятии. Практические, лабораторные работы проводятся в современных компьютерных классах, где установлены демоверсии программ автоматизации бухгалтерского, управленческого, налогового учета, управления финансовыми, товарными потоками.

> «Преподавание экономических дисциплин не терпит вчерашнего дня»

С выпускниками факультета экономики и управления Марина Евгеньевна поддерживает плотную связь:

*– Это мои ученики, друзья, надёжные партнёры факультета.*

Как успешный руководитель Марина Карпицкая стремится к личностному росту, занимается планированием и последовательно идёт к цели. Под её научным руководством выпускница факультета Юлия Крупенко защитила кандидатскую диссертацию. Являясь автором учебных пособий, монографий и более сотни научных статей и шестидесяти с индексом цитирования, она стремительно идёт к подготовке и защите докторской диссертации по развитию страхового бизнеса в рамках конкурентного функционирования рынка стран ЕАЭС.

### Главная траектория жизни

С предпринимательской жилкой Марина Карпицкая, кажется, родилась. Свой первый «бизнес-проект» она реализовала в пятилетнем возрасте:

*– Мы с ребятами в деревне устраивали воскресные праздники для местных жителей, которые после посещения костёла отдыхали на лавочках вдоль центральной улицы. За старания иногда нас угощали конфетами или даже давали деньги.*

В семье, где росла Марина Евгеньевна, воспитывалось трое детей, которые рано остались без отца. Тогда Марине было девять лет, старшему брату – тринадцать, а младшей сестрёнке – всего шесть.

*– Мама работала школьным учителем и была для нас не только наставником, подругой, советчиком, но и ярким образцом для подражания,* – вспоминает собеседница.

Пока мама трудилась, дети выполняли всю работу по дому с чётким разделением обязанностей:

*– Старший брат выделял нам с сестрой участки работы, но основную нагрузку брал на себя. Промедление – смерти подобно. Мы должны были успеть выполнить уроки и всё сделать по хозяйству. Сегодня с уверенностью могу сказать, что труд не только облагораживает человека, но и делает его системным и уверенным в себе.*

В своём стремлении быть лучшей, стать маминой гордостью, с первого класса Марина Карпицкая была не только массовиком-затейником различных мероприятий, но и училась в музыкальной школе, занималась спортом. Активисткой она была и в свои студенческие годы, что позволило, по словам собеседницы, получить работу в Гродно, а не уехать в Мурманск, Оленегорск или на Сахалин.

Сегодня Марина Карпицкая с гордостью заявляет, что умеет делать всё.

> «Уверена, труд не только облагораживает человека, но и делает его системным и уверенным в себе»

Динамизм – это качество её жизни.

*– Мне кажется, что я всё время бегу спринт. Неугомонность и непоседливость, думаю, и есть залог моего успеха,* – резюмирует собеседница.

### Искусство менеджмента

К организации своей жизни Марина Евгеньевна подходит со всей ответственностью:

*– Я вынуждена очень жёстко планировать свой день, ведь погрешность даже в 15 минут может внести хаос в дальнейший распорядок. Ежедневно два часа я должна посвятить научной работе, познакомиться с новыми публикациями, изменениями в законодательстве – преподавание экономических дисциплин не терпит вчерашнего дня.*

Чего сегодня Марине Евгеньевне не хватает, так это физического времени. Она допускает, что отсутствие потребности восстанавливать силы во сне позволило бы выполнить еще больше полезных дел:

*– Не задумываясь, отдаю себя другим людям и, наверное, частичка их энергии подпитывает меня. Всё возвращается бумерангом: я заряжаюсь, затем с новой силой отдаюсь и взамен получаю любовь.*

У Марины Евгеньевны в разные периоды жизни было много вдохновляющих примеров. В школьные годы – это первый учитель. Молодой, неопытной выпускнице, распределенной на предприятие «Торгодежда Гродненской области», помогла поверить в себя главный бухгалтер Тереза Тарасевич. В Купаловском университете, куда Марина Евгеньевна пришла работать 20 лет назад, своевременную поддержку оказал Юрий Белых – на тот момент декан молодого факультета экономики и управления. В научном становлении главную роль, по словам собеседницы, сыграла доктор экономических наук, профессор кафедры налогов и налогообложения Белорусского государственного экономического университета Тамара Сорокина:

*– С Тамарой Владимировной мы случайно познакомились в студенческой столовой БГЭУ, когда я была аспирантом. Она не являлась моим научным руководителем. Это человек, который всегда был рядом, советовал и личным примером показывал, каким должен быть настоящий учёный.*

В плане служения обществу, умения всегда найти нужные слова бесспорным авторитетом для Марины Евгеньевны является активная женщина, которая прошла путь от учителя до заместителя председателя облисполкома, Мария Бирюкова.

### То, что дарит вдохновение

Всё, что делает Марина Евгеньевна, делает с энтузиазмом. Не исключение и воспитание дочери. Сегодня 11-летняя Ангелина не только отлично учится, играет на флейте, выступает на школьных мероприятиях, но уже и начинающий предприниматель. Она увлечена созданием игрушек слаймов, а вырученные от реализации средства направляет на благотворительность.

*– Меня радует, что мой ребёнок вовлечен в полезную деятельность и волонтёрское движение ОО «БСЖ». Сегодня волонтёрское движение увлекает гимназистов, студентов, магистрантов и коллег,* – поделилась собеседница.

Есть у Марины Евгеньевны хобби – цветоводство и флористика. На малой родине она выращивает цветы, которые украшают усадьбу от ранней весны до поздней осени.

> «Не задумываясь, отдаю себя другим людям и, наверное, частичка их энергии подпитывает меня»

*– Каждый распустившийся новый цветок дарит мне вдохновение,* – признался собеседница.

В копилке наград Марины Евгеньевны – многочисленные дипломы, грамоты, медали, и, конечно же, отзывы благодарных людей. Но это только начало, ведь траектория жизни этой неугомонной женщины определяется уверенным стремлением к цели.

**Татьяна СУШКО**

**Введение в эксплуатацию современного 13-этажного здания общежития по улице Дубко планируется в 2020 году**

РЕЙТИНГИ

# СТАТУС КУПАЛОВЦЕВ В МИРЕ

По оценкам международных рейтингов Гродненский государственный университет имени Янки Купалы является одним из лидеров в Республике Беларусь и входит в 10 – 15% лучших вузов мира. Это позволяет полноценно участвовать в международных программах и проектах, привлекать абитуриентов из десятков стран.

В мире насчитывается более 30 000 учреждений, работающих в сфере высшего образования, поэтому абитуриентам, деловым партнерам и органам государственного управления необходим универсальный инструмент оценки, позволяющий сравнивать преимущества и потенциал университетов.

Каждый рейтинг сфокусирован на определенных критериях оценки, которые делятся на три большие группы: научная активность, репутация университета, качество образования.

Рейтинг **Webometrics** охватывает наибольшее количество учреждений образования и, в отличие от других, присваивает место всем университетам Беларуси, что позволяет производить сравнение на национальном уровне. Гродненский государственный университет имени Янки Купалы в 2019 году занимает 3 место среди вузов страны и 3382-е место в мировом рейтинге. Лидером среди национальных университетов в рейтинге Webometrics является БГУ. Второе и третье место в разные годы занимали БНТУ и ГрГУ имени Янки Купалы.

Рейтинг **QS World University Rankings** позиционирует только 1000 лучших университетов мира в глобальном рейтинге и по 300 учреждений в локальных исследованиях. В системе рейтингов QS зарегистрированы 12 белорусских учреждений высшего образования, из которых два входят в основной список лучших университетов (БГУ – 351 и БНТУ – «801–1000») и четыре – в региональный список ТОП-300 QS EECA (Развивающейся Европы и Центральной Азии): БГУ – 23 место, БНТУ – 95 место, БГУИР – 137 место, ГрГУ имени Янки Купалы – место в группе «151–160» из трех тысяч участников. Гродненский государственный университет имени Янки Купалы является единственным региональным университетом Республики Беларусь, который включен в систему рейтингов QS, а также единственным белорусским университетом, который улучшил показатели по результатам 2018 года.

Наиболее высокой позиции ГрГУ имени Янки Купалы достиг по показателю «репутация среди работодателей». Это стало возможным благодаря активной работе факультетов по привлечению академических экспертов и работодателей-экспертов, число которых в 2019 году составило 137 и 176 человек соответственно. Наибольшее количество экспертов было предоставлено факультетом математики и информатики.

Рейтинг **UniRank (4icu)** формируется на основе популярности и посещаемости сайтов. В него вошло 47 учреждений высшего образования Республики Беларусь: БГУ занимает 1 место (624 позиция в мировом рейтинге), ГрГУ имени Янки Купалы – 2 место в Беларуси (2369), БНТУ – 3 место (3042).

Помимо основного рейтинга UniRank публикует информацию о наиболее популярных Интернет-сообществах университетов и колледжей. По результатам Twitter University Rankings за 2019 год Купаловский университет занял 2 место, Instagram University Ranking – 4 место, в рейтинге YouTube University Rankings – 5 место в республике. Лидер среди белорусских университетов в рейтинге Facebook и YouTube – БГМУ, а в Instagram – БГЭУ.

В Международный рейтинг высших учебных заведений **ARES-2019** были включены 27 белорусских учреждений высшего образования. С 2018 года ГрГУ имени Янки Купалы занимает 5 место (индекс BB+), что подтверждает статус университета с надежным качеством преподавания, научной деятельности и востребованности выпускников работодателями.

Самыми престижными и сложными для участия международными рейтингами являются **SIR (SCImago Institutions Rankings), THE (Times Higher Education) World University Rankings, The Academic Ranking of World Universities (ARWU, Шанхайский рейтинг)**. Они сосредоточены на научных достижениях высокого уровня, количестве и качестве научных публикаций, индексах цитирования, академической репутации в мировой среде. Так, в рейтинг SIR из Беларуси входят только три учреждения: НАН Беларуси, БГУ, БНТУ, ученые которых опубликовали за последний год более 100 научных статей, включенных в базу данных Scopus (ГрГУ имени Янки Купалы – 41 статья в 2018 году, 23 – за первое полугодие 2019 года). В рейтинге THE (Times Higher Education) зарегистрированы шесть учреждений образования из Беларуси, в том числе ГрГУ имени Янки Купалы, но только БГУ входит в число ранжируемых (1000+).

Наиболее авторитетными источниками наукометрических измерений для рейтингов являются базы данных **Scopus** и **Web of Science**. Основная доля статей ученых нашего университета в базе данных Scopus относится к области физики и астрономии (309 статей), каждая шестая – к инженерии (229 статей), около 14% – к математическим наукам (170 статей). Наименьший удельный вес (менее 5 статей) занимают статьи, посвященные психологии, наукам о здоровье, экономике, эконометрике и финансам, наукам об окружающей среде (см. диаграмму).

Сегодня всё больший вес приобретают индивидуальные наукометрические показатели исследователей. Каждый преподаватель и научный работник в своей области вносит вклад в имидж и рейтинг университета. Одной из главных задач нашего университета является увеличение количества цитируемых публикаций сотрудников, зарегистрированных в мировых базах данных. Не все публикации в журналах, входящих в базу Scopus, корректно индексируются и повышают рейтинг автора и университета.

С декабря 2017 года доступ к наукометрической реферативной базе данных Scopus организован для всех работников в локальной сети университета, с марта 2019 года также на сайте научной библиотеки доступна полнотекстовая база данных журналов и книг издательства Elsevier на платформе ScienceDirect.

YANKA KUPALA STATE UNIVERSITY OF GRODNO

OVERALL RANK **151-160**

OVERALL, THE INSTITUTION IMPROVED ON ITS 2018 PERFORMANCE BY MOVING FROM 191-200 TO 151-160.

Проконсультироваться по вопросам требований международных рейтинговых систем при публикации научных работ можно в научной библиотеке, информационно-аналитическом центре, центре интернационализации образования и других структурных подразделениях по направлениям деятельности.

При публикации работ необходимо соблюдать ряд формальных правил:

- всегда использовать одинаковое англоязычное написание, собственной фамилии и инициалов;
- указывать только общепринятое официальное название университета;
- проводить исследования в составе авторитетной международной группы ученых.




Подробнее об участии университета в международных рейтингах можно узнать на Интранет-портале и официальном сайте университета **www.grsu.by** и на сайте научной библиотеки **www.lib.grsu.by**

**Информационно-аналитический центр**

**Абитуриенты ГрГУ имени Янки Купалы одними из первых в стране узнали о зачислении в университет**

ГІСТОРЫЮ ЎНІВЕРСІТЭТА – ПІШАМ РАЗАМ!

# РАМАНТЫКА СТУДАТРАДАЎ

**Як у мінулым стагоддзі, так і сёння, рух студэнцкіх атрадаў застаецца актуальнай тэмай. Моладзь вабіць не толькі першы заробак, але і подых самастойнага жыцця, сяброўства, каханне... Адным словам - рамантыка.**

### ТРАДЫЦЫІ МІНУЛАГА

Згодна з архіўнымі звесткамі, якія захоўваюцца ў Музеі развіцця ГрДУ імя Янкі Купалы, першы студатрад купалаўцаў быў створаны ў 1963 годзе. У яго склад уваходзіла 110 юнакоў і дзяўчат, якія адправіліся за шмат кіламетраў ад дома на будаўніцтва жылых і сельскагаспадарчых аб'ектаў у пасёлак Фурманава Калінінградскай вобласці. Планавае заданне тады было перавыканана на 43%, за што атрад узнагародзілі Памятным сцягам Фурманскага РК ЛКСМ Казахскай ССР. У наступным годзе ў Гродзенскім педагагічным інстытуце сфарміравалася ўжо два атрады ў складзе 130 чалавек, якія былі накіраваны ва Уральскую вобласць Казахскай ССР. З 1968 года студатрады працавалі не толькі на Урале, але і ў Беларусі. Так, у Гродна і Гродзенскай вобласці дзейнічала шэсць атрадаў. У 1974 годзе студэнты 2 курса гісторыка-педагагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута, якія ўваходзілі ў студатрад "Белая Русь", пералічылі ўвесь свой заробак, а гэта 1 750 рублёў, у Фонд міру. А ў 1975 годзе ўсе запрацаваныя грошы былі пералічаны ў фонд будаўніцтва Палацу піянераў горада Гродна.

Студэнты не толькі працавалі на ўсесаюзнай будоўлі, калгасах і саўгасах, але і вялі шэфства над сельскімі школамі, удзельнічалі ў арганізацыі і працы летніх лагераў для школьнікаў, праводзілі выхаваўчую працу з "цяжкімі падлеткамі", даглядалі помнікі загінулых у гады вайны, а таксама дапамагалі рамантаваць і афармляць сельскія клубы і бібліятэкі.



### ПРАЗ ПЯЦЬДЗЯСЯТ ШЭСЦЬ ГОД...

З пары першага студатрада прайшло пяцьдзясят шэсць год, але попыт на працу сярод студэнцкай моладзі падчас летніх канікул штогод толькі ўзрастае.

Сёлета 700 студэнтам-купалаўцам удалося папрацаваць у педагагічных, будаўнічых, сэрвісных, прамысловых і экалагічных сферах на прадпрыемствах Беларусі і Расіі. Усяго ў гэтым годзе дзейнічала 40 студатрадаў.

Самыя шматлікія – педагагічныя. У студэнтаў была выдатная магчымасць атрымаць практычны вопыт работы з дзецьмі ў летніх аздараўляльных лагерах Беларусі – "Купалінка", "Зорка Юбілейная", "Сузор'е", а таксама "Жамчужына Расіі" ў горадзе Анапа Расійскай Федэрацыі.

**Галаўкова Вольга**, студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта, на працягу 18 дзён працавала выхавальнікам у лагеры "Дружба". На гэты час ёй было даверана 40 дзяцей ад сямі да дзесяці гадоў. Кола яе абавязкаў – выхаванне, догляд за дзецьмі, падрыхтоўка мерапрыемстваў, адсочванне рэжыму дня:

*– У лагеры ўжо працую трэці год запар. Набіраюся вопыту ў педагагічнай працы. Цудоўна, што ёсць магчымасць папрацаваць з дзецьмі розных узростаў. Калі знаходзішся з імі 24 гадзіны сем дзён на тыдзень, то хочаш не хочаш, а пераживаеш разам з імі, радуешся разам з імі і вучышся знаходзіць падыход да кожнага. Адначасова пераконваешся ў правільнасці абранай спецыяльнасці.*

**Мікіта Гура**, студэнт 3 курса, юрыдычнага факультэта, у якасці камандзіра атрада працаваў у лагеры "Жамчужына Расіі" ў горадзе Анапа. У яго функцыі ўваходзіла праца з важатымі, а таксама з дзецьмі ва ўзросце ад сямі да сямнаццаці год:

*– Падчас працы з дзецьмі я адпачываю псіхалагічна. Мне падабаецца назіраць за дзецьмі. Яны заўсёды вучаць чамусьці новаму. Да таго ж вопыт узаемадносін з людзьмі мне спатрэбіцца ў маёй далейшай прафесійнай дзейнасці.*

У гэтым годзе з'явіўся і экалагічны студатрад, байцы якога працавалі на ГЛГУ "Гродзенскі лясгас". Студэнтка 3 курса факультэта біялогіі і экалогіі **Кацярына Аксёнкіна**, якая была ў складзе гэтага атрада, падзялілася сваімі ўражаннямі:

*– А восьмай гадзіне раніцы нас на аўтобусе адвозілі ў поле, дзе мы высаджвалі маладзенькія бярозкі, клёнікі, елачкі, дубкі. Для мяня гэта быў карысны вопыт, таму што ляснічыя нам расказвалі пра спецыфіку іх работы, пра асаблівасці дрэў. Мы мелі магчымасць хадзіць у лес і збіраць рэдкія расліны.*

Не менш актыўны ўдзел купалаўцы прынялі ў будатрадах на аб'ектах ААТ "Белцеплаізаляцыя", КУП "Рэмбудаўтадор", "Гроднапрамбуд", Беларуская АЭС, ГрДУ імя Янкі Купалы і іншых.

Камандзірам будатрада з 8 чэрвеня па 23 жніўня быў **Дзмітрый Ківель**. Пад яго кіраўніцтвам атрад выконваў будаўнічыя працы на аб'екце ўніверсітэта.

*– Мне трэба было замацоўваць пэўныя ўчасткі работ за канкрэтнымі студэнтамі, правяраць якасць выкананай працы, адсочваць розныя нюансы па дапрацоўцы і самому ўдзельнічаць у працы па аздабленні корпуса інтэрната. У першую чаргу я атрымаў добры вопыт кіраўніка.*




У складзе сэрвісных атрадаў студэнты працавалі ў Цэнтры тэсціравання і прыёмнай камісіі ГрДУ імя Янкі Купалы, а таксама кухоннымі рабочымі і выратавальнікамі ў летнім аздараўляльным лагеры "Жамчужына Расіі" ў горадзе Анапа.

Акрамя таго, студэнты Купалаўскага ўніверсітэта ў складзе вытворчых атрадаў былі задзейнічаны на сумесным расійска-беларускім прадпрыемстве СААТ "ДЗІФА" па вырабу фільтраў ачысткі паветра, масла і паліва для легкавой, грузавой, сельскагаспадарчай і дарожнай тэхнікі.

Адпачываюць байцы студатрадаў падчас арганізаваных культурных мерапрыемстваў, спартыўных, творчых, інтэлектуальных турніраў.

Час ідзе, студэнты змяняюць адзін аднаго, а рамантыка студатрадаў застаецца ў памяці назаўсёды.

**Таццяна СУШКО**

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»
ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1968 года

Шаноўныя сябры! У нашым імкненні быць бліжэй да Вас мы стварылі сайт газеты "Гродзенскі ўніверсітэт", які даступны ў інтэрнэт-пrасторы
www.gazeta.grsu.by



**ЗАСНАВАЛЬНІК:**
**УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1083.
Выдадзена 21.01.2010 г.
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Падпісана да друку:** 02.09.2019 у 09.00.
**Аб'ём** – 4 друк. арк. **Тыраж** 1000 экз. **Заказ** № 3857.

**ДРУК:** ГАУПП «Гродзенская друкарня»,
230025, г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4.
ЛП 02330/39 ад 27.03.2014 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
Вул. Ажэшкі, 22, пакой 335, 230023, Гродна.
Тэл.: 32-02-29. E-mail: grod_univ@grsu.by

**Рэдактар:** Сушко Таццяна Сяргееўна
**Мастацкі рэдактар:** Ботвінка Ганна Уладзіміраўна